**НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ**

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЕРАЛІК ДАКУМЕНТАЎ ДА ВЫСТАВЫ, ПРЫСВЕЧАНАЙ 125-ГОДДЗЮ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ КЛАСІКА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ М.А. БАГДАНОВІЧА

## Дакументы да радаводу Максіма Багдановіча, яго працоўнай і грамадскай дзейнасці

| № № п/п | Дата дакумента | Загаловак дакумента альбо справы, анатацыя да дакумента альбо справы | Пошукавыя дадзеныя (фонд, вопіс, справа, аркуш) | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1. | 1799–1864 | Справа Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу аб дваранскім паходжанні роду Мякотаў, продкаў маці М.Багдановіча. | Ф. 319. Воп. 2. Спр. 2186. Арк. 1–169адв. | Польск., руск. |
| 2. | 08.08.1799 | Пратакол Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 8 жніўня 1799 г. аб зацвярджэнні ў дваранскай годнасці роду Мякотаў, продкаў маці М.Багдановіча. | Ф. 319. Воп. 1. Спр. 15. Арк. 27–28. | Польск. |
| 3. | 1800–1833 | Генеалагічная табліца дваранскага роду Мякотаў, продкаў маці М.Багдановіча. | Ф. 319. Воп. 1. Спр. 21. Арк. 68. | Польск. |
| 4. | 1811 | Рэвізкая сказка сялян сяла Касарычы Бабруйскага павета Мінскай губерні памешчыка Іосіфа Казіміравіча Вішчынскага за 1811 г., дзе сярод дваровых людзей пад № 65 пазначана сям'я Нічыпара Багдановіча, продка М.Багдановіча. | Ф. 333. Воп. 9. Спр. 197. Арк. 127–129. | |
| 5. | 1816 | Рэвізкая сказка сялян сяла і двара Касарычы Бабруйскага павета Мінскай губерні памешчыка Іосіфа Казіміравіча Вішчынскага | Ф. 333. Воп. 9. Спр. 95. Арк. 254–263. | |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| | | за 1816 г., дзе сярод дваровых людзей пад № 55 пазначана сям'я Сцяпана Багдановіча, у тым ліку яго сын Лук'ян, прадзед М. Багдановіча. | | |
| 6. | 1834 | Рэвізкая сказка сялян сяла Касарычі Бабруйскага павета Мінскай губерні памешчыка Іосіфа Казіміравіча Вішчынскага за 1834 г., дзе сярод дваровых людзей пад № 39 и 40 пазначаны сем'і продкаў М.Багдановіча, у тым ліку сям'я яго прадзеда Лук'яна Сцяпанавіча Багдановіча. | Ф. 333. Воп. 9. Спр. 527. Арк. 271–271. | |
| 7. | 1834 | Фармулярны спіс уніяцкіх святароў Мінскай губерні за 1834 г., дзе пад № 94 указаны настаяцель Сямёнавіцкай царквы Ігуменскага павета Ян Сцяпанаў сын Мякота, прадзед М. Багдановіча. | Ф. 3245. Воп. 2. Спр. 257. Арк. 70адв.–71. | |
| 8. | 1850 | Рэвізкая сказка сялян маёнтка Касарычы Бабруйскага павета Мінскай губерні памешчыка Аляксандра Дамінікавіча Лапы за 1850 г., дзе сярод дваровых людзей пад № 32 пазначана сям'я Лук'яна Сцяпанавіча Багдановіча, у тым ліку дзед М.Багдановіча Юрый (Ягор) Лук'янавіч Багдановіч. | Ф. 333. Воп. 9. Спр. 628. Арк. 467Б адв. –467В. | |
| 9. | 1858 | Рэвізкая сказка сялян маёнтка Касарычы Бабруйскага павета Мінскай губерні памешчыка Аляксандра Дамінікавіча Лапы за 1858 г., дзе сярод дваровых людзей пад № 32 пазначана сям'я Лук'яна Сцяпанавіча Багдановіча, у тым ліку дзед М. Багдановіча | Ф. 333. Воп. 9. Спр. 1077. Арк. 585адв.–586. | |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| | | Юрый (Ягор) Лук'янавіч Багдановіч. | | |
| 10. | 20. (25).03.1862 | Запіс у метрычнай кнізе Халопеніцкай праваслаўнай царквы Барысаўскага павета Мінскай губерні аб нараджэнні 20 сакавіка і хрышчэнні 25 сакавіка 1862 г. Адама, сына селяніна Георгія Лук'янава Багдановіча і яго законнай жонкі Ганны Фаміной. | Ф. 136. Воп. 14. Спр. 299. Арк. 1447адв.–1448. | Запіс у метрычнай кнізе зроблены паводле ўказа Мінскай духоўнай кансісторыі № 2667 у сакавіку 1879 г. |
| 11. | 02.10.1868 | Ліст Мінскага губернатара ў Мінскае губернскае праўленне ад 2 кастрычніка 1868 г. аб звальненні з пасады сакратара Ігуменскай гарадской думы губернскага сакратара А.Мякоты, дзеда М. Багдановіча. | Ф. 299. Воп. 7. Спр. 2147. Арк. 1. | |
| 12. | 1885 | Спісы пенсіянераў грамадзянскага ведамства Мінскай губерні, дзе пад № 12796 пазначана сям'я ўдавы губернскага сакратара наглядчыка Ігуменскай гарадской бальніцы Таццяны Мякота, у тым ліку яе дачка Марыя, маці М. Багдановіча. | Ф. 333. Воп.1. Спр. 2903. Арк. 183адв. | |
| 13. | 1886 | Распараджэнне дырэктара Мінскай дырэкцыі народных вучылішч настаўніку 1-га Мінскага прыходскага вучылішча А.Я. Багдановічу аб прадстаўленні звестак аб яго літаратурных працах. | Ф. 458. Воп. 1. Спр. 126. Арк. 12. | |
| 14. | 04.01.1887 | Рапарт настаўніка 1-га Мінскага прыходскага вучылішча А.Я. Багдановіча дырэктару народных вучылішч Мінскай губерні ад 4 студзеня 1887 г. аб сваёй навуковай і літаратурнай дзейнасці. | Ф. 458. Воп. 1. Спр. 126. Арк. 14–17. | |
| 15. | 04.02.1887 | Ведамасць аб асобах, якія знаходзяцца на службе ў распараджэнні Мінскай дырэкцыі | Ф. 458. Воп. 1. Спр. 126. Арк. 3адв.–4. | |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| | | народных вучылішч і маюць літаратурныя і навуковыя працы, дзе ёсць звесткі аб навуковай дзейнасці А.Я. Багдановіча. | | |
| 16. | 1887 | Ведамасць аб навуковых і літаратурных працах настаўніка 1-га Мінскага прыходскага вучылішча А.Я. Багдановіча. | Ф. 458. Воп. 1. Спр. 126. Арк. 12адв.–13. | |
| 17. | 31.10.1916 | Прашэнне старшыні Мінскага аддзела Беларускага таварыства дапамогі ахвярам вайны мінскаму губернатару аб дазволе правядзення аднадзённага скарбоначнага збору ў г. Мінску 4 снежня 1916 г. на карысць таварыства. | Ф. 295. Воп. 1. Спр. 9187. Арк. 338. | Прашэнне напісана М.Багдановічам, выконваючым абавязкі сакратара. Рукапіс. Арыгінал. |
| 18. | 05.11.1916 | Спіс служачых Мінскай губернскай харчовай камісіі, якія маюць права закупаць прадукты ў харчовай краме Мінскага губернскага камітэта Усерасійскага земскага саюзу дапамогі хворым і параненым воінам. (У спісе пад № 5 значыцца Максім Адамавіч Багдановіч, які загадвае выпрацоўкай такс). | Ф. 700. Воп. 1. Спр.126. Арк. 295. | |
| 19. | 29.11.1916 | Прашэнне старшыні мінскага аддзела Беларускага таварыства дапамогі ахвярам вайны мінскаму губернатару аб дазволе правядзення публічнай лекцыі «Беларускае адрадзенне» («Беларускае адраджэнне») Максіма Адамавіча Багдановіча. | Ф. 295. Воп. 1. Спр. 9187. Арк. 409. | |
| 20. | 29.11.1916 | План лекцыі «Беларускае адраджэнне» М.А.Багдановіча. | Ф. 295. Воп. 1. Спр. 9187. Арк. 410. | |
| 21. | 01.11.1916–03.01.1917 | Пастановы паседжанняў Мінскай губернскай харчовай камісіі, дзе абавязкі сакратара выконваў М.А. Багдановіч. | Ф. 137. Воп. 1. Спр. 12. Арк. 117–195; Спр. 13. Арк. 5–23; | |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| | | | Спр. 14. Арк. 1–107. | |
| 22. | 22.12.1916 | Прашэнне старшыні Мінскага аддзела Беларускага таварыства дапамогі ахвярам вайны старшыні Мінскага губернскага Таццянінскага камітэта па аказанні часовай дапамогі пацярпелым ад ваенных дзеянняў, аб выдачы дзецям-сіротам пасёлка Ратамка, якія апякуюцца таварыствам, неабходнага ім адзення, абутку, бялізны. | Ф. 511. Воп.1. Спр. 10. Арк. 468. | Прашэнне напісана М. Багдановічам, выконваючым абавязкі сакратара. Рукапіс. Арыгінал. |
| 23. | 06.01.1917 | Прадпісанне мінскага губернатара мінскаму паліцмайстару аб обвяшчэнні старшыні мінскага аддзела Беларускага таварыства дапамогі ахвярам вайны, прысяжнаму паверанаму В. Чаўсаву адмовы арганізацыі публічнай лекцыі «Беларускае адраджэнне» М.А. Багдановіча. | Ф. 295. Воп. 1. Спр. 9187. Арк. 412. | |
| 24. | 1917 | Спіс асоб, у якіх паводле пастановы Мінскага губернскага камітэта Усерасійскага земскага саюза дапамогі хворым і параненым воінам, якія падлягаюць канфіскацыі харчовых кніжак (У спісе пад № 27 значыцца М.Багдановіч). | Ф. 700. Воп. 1. Спр. 126. Арк. 2адв. | |
| 25. | 1917 | Спіс асоб Мінскага губернскага камітэта Усерасійскага земскага саюза дапамогі хворым і параненым воінам, якім выдадзены кніжкі на атрыманне прадуктаў (У спісе пад № 139 значыцца М.А. Багдановіч, у графе: час выдачы кніжкі – 11 лістапада 1916 г.; у графе: пасада – памёр). | Ф. 700. Воп. 1. Спр. 125. Арк. 25. | |

Дакументы, звязаныя з гісторыяй дома Карказевічаў па Аляксандраўскай вуліцы ў г. Мінску (цяпер вул. М.Багдановіча), дзе нарадзіўся М. Багдановіч

| № № п/п | Дата дакумента | Загаловак дакумента альбо справы, анатацыя да дакумента альбо справы | Пошукавыя дадзеныя (фонд, вопіс, справа, аркуш) | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|
| **1** | **2** | **3** | **4** | **5** |
| 26. | 11.12.1878 | Прашэнне двараніна К. Карказевіча ў Мінскую аб’яднаную палату крымінальнага і грамадзянскага суда ад 11 снежня 1878 г., дзе пазначана, што зямельны пляц па Нова-Аляксандраўскай вуліцы ў г. Мінску, разам з усімі пабудовамі на ім, быў набыты Карказевічамі ў 1856 годзе. | Ф. 147. Воп. 3. Спр. 23514. Арк. 1–3. | |
| 27. | 1879 | Праект на пабудову дома пад літ. А на ўласным пляцы, які належаў памешчыцы Схалястыцы Карказевіч на Аляксандраўскай вуліцы ў г. Мінску, дзе ў 1891 г. нарадзіўся М. Багдановіч. | Ф. 1. Воп. 3. Спр. 96. Арк. 5адв.–6. | |
| 28. | 1881 | Акладная кніга для запісу падатку з нерухомай маёмасці жыхароў 3-й часткі г.Мінска за 1881 год, дзе па Аляксандраўскай вуліцы пазначаны драўляны дом К.Карказевіча. | Ф. 1. Воп. 3. Спр. 4. Арк. 102. | |
| 29. | 1882 | «План зямельнага пляца, размешчанага ў г. Мінску ў 3-й частцы на Нова- | Ф. 147. Воп. 3. Спр. 23514. Арк. 89. | |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| | | Аляксандраўскай вуліцы ўладання згодна з даннай, выдадзенай ў 1858 г. памешчыцы Схалястыцы Карказевіч. Абмежаванне пляца выканана і план гэты складзены, паводле існуючага цяпер уладання <…> згодна з прадпісаннем Мінскага губернскага праўлення ад 19 сакавіка 1882 года за № 225 Слуцкім павятовым каморнікам Паўлоўскім у гэтым жа 1882 годзе”.<br>На чарцяжы пазначаны існуючы двухпавярховы дом, што знаходзіўся ў глыбіні пляца. | | |
| 30. | 1882 | План двух зямельных пляцаў, змешчаных у 3-й частцы г. Мінска на Безыменнай і Нова-Аляксандраўскай вуліцах (цяпер вул. Старажоўская і вул. М. Багдановіча), і якія належалі памешчыцы С. Карказевіч і мешчаніну К. Бейліну, складзеныя слуцкім павятовым каморнікам Паўлоўскім. На плане пад № 7 пазначана «месца дома з 1-м паверхам мураваным і 2-м драўляным», што размяшчаўся ў глыбіні зямельнага пляца, які належаў Карказевічам. | Ф. 147. Воп. 3. Спр. 23514. Арк. 88. | |
| 31. | 1882 | План зямельнага пляца, які размяшчаўся ў г. Мінску ў 3-й частцы на Безыменнай вуліцы (цяпер вул. Старажоўская) і належаў К. Бейліну і межаваў з зямельным пляцам Карказевічаў. | Ф. 147. Воп. 1. Спр. 23514. Арк. 90. | |
| 32. | 1883 | Акладная кніга для запісу падатку з | Ф. 1. Воп. 3. Спр. 128. | |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| | | нерухомай маёмасці жыхароў г. Мінска за 1883 год, дзе на Аляксандраўскай вуліцы пазначаны драўляны дом К. Карказевіча. | Арк. 6адв.–7. | |
| 33. | 1884 | Акладная кніга для запісу падатку з нерухомай маёмасці жыхароў г. Мінска за 1884 год, дзе на Аляксандраўскай вуліцы пазначаны драўляны дом К. Карказевіча. | Ф. 1. Воп. 3. Спр. 134. Арк. 5адв.–6. | |
| 34. | 1888 | Акладная кніга для запісу падатку з нерухомай маёмасці жыхароў г. Мінска за 1888 год, дзе на Аляксандраўскай вуліцы пазначаны драўляны дом К. Карказевіча. | Ф. 1. Воп. 1. Спр. 1836. Арк. 6адв.–7. | |
| 35. | 1892 | Акладная кніга для запісу падатку з нерухомай маёмасці жыхароў г. Мінска за 1892 год, дзе на Аляксандраўскай вуліцы пазначаны: «драўляны дом на каменным сутарэнні [змешаны 2-павярховы] з прыбудовай». | Ф. 1. Воп. 1. Спр. 2462. Арк. 7адв.–8. | |
| 36. | 28.07.1894 | Праект на пабудову каменнага двухпавярховага з падвалам дома пад літ. А, мураванага хлява пад літ. В і мураванай стайні пад літ. С на пляцы, які належаў Карказевічам у 3-й частцы г. Мінска па Аляксандраўскай вуліцы. Праект зацверджаны 28 ліпеня 1894 г.<br>На чарцяжы ёсць галоўны фасад і разрэз мураванага двухпавярховага жылога дома (цяпер дом № 25 па вул. М. Багдановіча ў г.Мінску). | Ф. 1. Воп. 3. Спр. 7. Арк. 303. | |
| 37. | 1910 | Апісанне нерухомай маёмасці на пляцы № 3 у квартале № 45 па Аляксандраўскай вуліцы ў г. | Ф. 1. Воп. 1. Спр. 4862. Арк. 16. | |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|
| | | Мінску за 1910 г., дзе пазначаны: «мураваны 2-х павярховы дом з лаўкамі, у двары драўляны дом на мураваным сутарэнні, мураваная афіцына і тры мураваныя хлявы і каля 500 кв. саж. уласнай зямлі». | | |
| 38. | 1910 | Спіс пабудоў на пляцы № 3 у квартале № 45 па Аляксандраўскай вуліцы ў г. Мінску за 1910 г., дзе пазначаны пад літ. Б: змешаны двухпавярховы дом з сутарэнням і мезанінам накрыты бляхай. Яго памеры: 33×15×10 арш. Плошча каля 485 кв. арш. | Ф. 1. Воп. 1. Спр. 4862. Арк. 16адв. | |
| 39. | 1910 | Апісанне памяшканняў у змешаным двухпавярховым доме, які знаходзіўся на пляцы № 3 у квартале № 45 па Аляксандраўскай вуліцы ў г. Мінску за 1910г., дзе нарадзіўся М. Багдановіч. | Ф. 1. Воп. 1. Спр. 4862. Арк. 27–36. | |
| 40. | 1910 | План зямлі з размяшчэннем пабудоў на пляцы № 3 у квартале № 45 па Аляксандраўскай вуліцы ў г. Мінску за 1910г., дзе пад літ. Б у глыбіні пляца пазначаны змешаны двухпавярховы жылы дом, дзе нарадзіўся М. Багдановіч. | Ф. 1. Воп. 1. Спр. 4862. Арк. 37. | |

Складальнік:
галоўны архівіст У.М. Дзянісаў

Дырэктар архіва Д.У. Яцэвіч

30.09.2016